За Совецкую Айчыну ідуць у бой сыны ўсіх народаў Совецкага Саюза.
Няхай жыве ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ — армія братэрства і дружбы народаў СССР!
Заклікі ЦК ВКП(б)

Смерць нямецкім акупантам!

Библиотека АН БССР

# Сцяг свабоды

ОРГАН МІРСКАГА РАЙКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

№ 5 Серада, 23 лютага 1944 г.

ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

**Доблесныя воіны Чырвонай Арміі!**
Вас чакаюць, як вызваліцеляў мільёны совецкіх людзей, якія пакутуюць пад нямецка-фашысцкім ігам!
**Мацней бейце ворага і знішчайце нямецкіх разбойнікаў!**
***Уперад на захад!***
Заклікі ЦК ВКП(б)

## *Ад перамогі да перамогі*

26-ці гадовы баявы шлях Чырвонай Арміі — гэта шлях вялікіх перамог над усімі ворагамі нашай Радзімы. Ужо на пачатку свайго існавання, ў 1918 годзе, калі нямецкія захопніцкія арміі накіравалі свае крывавыя кіпцюры да сэрца рэвалюцыі — да Ленінграда — маладая ўзброеная сіла вызваленых народаў нанесла сакрушальны ўдар гэтаму як і іншым ворагам совецкай зямлі.

Стальныя рады Чырвонай Арміі, выхаваныя большэвіцкай партыяй, выхаваныя Леніным і беспасрэдна кіраваныя Сталіным на працягу мінулых 26 гадоў вырaслі ў грознейшую, магутнейшую ўзброеную сілу.

Увесь свет з'яўляецца сведкай гістарычных перамог Чырвонай Арміі над гітлераўскай навалыніцай. Азвярэлыя фашысцкія орды, якія знішчылі ўсё, што спаткалі на сваім шляху, якія заняволілі шмат народаў і краін у Еўропе, толькі з боку Чырвонай Арміі сустрэлі такі адпор, які змушае іх усё больш і больш адкаціцца на захад. Увесь свет здзіўлены гэтай цудоўнай сілай нашай Арміі. Адны са страхам, другія з радасцю — ўсе змушаны прызнаць, што толькі Чырвоная Армія ў сілах знішчыць фашысцкага гада і гэтым самым выратаваць увесь свет ад найвялікшай пагрозы знішчэння ўсяго таго, што было створана народамі.

Крыніцай гэтай нячуванай сілы нашай арміі з'яўляецца яе сапраўдна народны характар, яе натхнёнасць ідэяй барацьбы за незалежнасць нашай соцыялістычнай Радзімы. Да шматлікіх франтоў, як і ў партызанскім тылу пайшлі лепшыя людзі совецкіх народаў. Усе як адзін мабілізавалі ўсе свае творчыя сілы для дапамогі фронту. Фронт і тыл зліліся ў адзін вялікі ўзброены кулак, які знішчае фашысцкія полчышчы.

Крыніцай невычэрпнасці і ўсцяж растучай сілы нашай арміі — у безупынных клопатах нашай партыі, нашага ўраду і беспасрэдна таварыша Сталіна па павялічэнні яе баявой магутнасці, для забеспячэння яе ўсёй тэхнікай і лепшай зброяй.

Таму і сустракае наш народ 26-ю гадавіну Чырвонай Арміі ў такой веры ў канчатковую перамогу. Разгром немцаў на ўсім працягу франтоў ад Сталінграда да Луцка напаўняе ўсіх упэўненасцю ў тым, што недалёк той дзень, калі сілай Чырвонай Арміі, пры дапамозе партызан, вораг будзе канчаткова знішчаны.

26-ая гадавіна Чырвонай Арміі абавязвае ўсіх грамадзян нашай вялікай Радзімы да яшчэ большага напружання сіл, каб прыбліжаць дзень поўнага нашага вызвалення.

## *Кривой Рог освобожден*

Войска 3-го Украинского фронта, продолжая наступление, после ожесточенных боев сломили сопротивление противника и 22 февраля штурмом овладели крупным промышленным центром Украины городом КРИВОЙ РОГ.

Юго-западнее и южнее гор. Луга наши войска продолжали вести наступление и заняли ряд населенных пунктов.

Юго-западнее и южнее озера ИЛЬМЕНЬ наши войска, 21-го февраля, овладели районными центрами Ленинградской области городом Сольцы, Волот, Поддорье, райцентром Калининской области городом ХОЛМ а также в течение 21—22 февраля более 300 населенными пунктами.

Западнее и юго-западнее гор. Холм наши войска с боями продвигались вперед и заняли более 100 населенных пунктов.

## Разгром немцев южнее Звенигородка

После ликвидации окруженных немцев в районе Корсунь-Шевченковский наши войска обрушили удар против немецких войск, пытавшихся помочь окруженной группировке.

В результате стремительного удара, противник потерял убитыми до 27 тысяч солдат и офицеров. Около 1500 человек взято в плен. Уничтожено: 326 самолетов, 327 танков, 1638 автомашин и 446 орудий.

Кроме того захвачено много трофеев.

**Адважныя партызаны і партызанкі! Усямерна узмацняйце дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі, грамiце тылы і штабы ворага! Ратуйце совецкіх людзей ад знішчэння і угона іх на катаргу ў Нямеччыну. Бязлітасна знішчайце нямецка - фашысцкіх ізвергаў!**

**Няхай жывуць совецкія *партызаны і партызанкі!*** Заклікі ЦК ВКП(б)

# І пачалася такая мясарубка...

17-га лютага Чырвоная Армія закончыла знішчэнне акружаных 10-ці гітлераўскіх дывізій у раёне Кореунь-Шаўчэнкаўскі. У гэтым баю было знішчана 55 тысяч гітлераўцаў і 18 тысяч здалося ў палон.

Вось што апавядаюць аб гэтым змаганні Людвіг Райман, Вендлінг Вэйс і Гэнрых Мюлер—нямецкія палонныя з дывізіі СС „Вікінг“: „Спачатку нам афіцэры нічога не гаварылі, хоць нам было ясна, што мы папалі ў лавушку. 5-га лютага ўсім зачыталі загад Гітлера, у якім абяцалася нам дапамога. Камандзір дывізіі заявіў, што на выручку нам выслана 8 танкавых дывізій. Нам нават зачыталі радыёграму камандзіра танкавай арміі генерала-лейтэнанта Хубэ, у якой было толькі чатыры словы: „Я вас выручу. Хубэ“.

Ды дарма—не дапамаглі загады, ні радыёграмы. Кальцо Чырвонай Арміі з кожным днём ставалася ўсе цяснейшым. Дывізія „Вікінг“ ужо страціла больш 3.000 салдат з агульнай колькасці 7.000. Адступалі мы пад ураганным агнём рускіх, пакідаючы машыны і гарматы. Нас ахапіў жудасны настрой.

Уночы на 17 лютага нам выдалі павялічаныя порцыі гарэлкі, дазволілі з'есці апошнія запасы прадуктаў. На світанні была наша апошняя спроба прабіцца. Не пасьпелі мы прайсці і трохсот метраў, як на нашу калону награнулі совецкія танкі і пачалі не „уцюжыць“ і душыць. Услед за танкамі наляцелі казакі. І пачалася такая мясарубка, якой мы яшчэ не бачылі ад пачатку вайны. Нам удалося схавацца пад разбітыя аўтамашыны. На другі дзень мы здаліся ў палон“.

## Бой быў прыняты

Партызанскі атрад, якім камандуе Дзімітры Д. 26-ю гадавіну Чырвонай Арміі адзначыў боем з фашыстамі. Немцы і паліцыя суседніх гарнізонаў Мірскага раёна чорнай гурбою напаўзлі на адзін участак гасцінца.

Камандзір рашыў з сваім атрадам уступіць у бой. Калі фашысты напароліся на партызанскую засаду і там іх здорава „пагрэлі“ узвод, якім камандуе Вася Ф. заняў хутары В. і паліваючы кулямётным агнём уцякаючых немцаў, адрэзаў ім адыход у гарнізон Т.

Кулямётчык Коля К. далёка ўперадзе. Ён не перастае страляць нават тады, калі яго ранілі ў ногу. Агонь фашыстаў не спыняецца. Не гледзячы на тое, што кулі рваліся навокал адважнага кулямётчыка, партызаны Віця С. і Кастусь К. змаглі вынесці раненага таварыша. У гэтым баю было знішчана 7 фашысцкіх нягоднікаў і 12 ранена.

Коннік.

---

Група партызан з атрада „Сокал“ пад камандай тав. Ш. знішчыла да 2 км. варожай сувязі.

# ПАРТИЗАНСКИЙ КРАЙ

В Ленінградскую область ушлі „партізаніть“ сыны „города героев“ рабочіе Ленінграда, горящие желаніем собственной грудью защіщать „колыбель Революціі“.

И пошлі партізанскіе „дела“! Везде была полностью восстановлена советская власть. Еслі бывало враг наскочіт на деревню і ограбіт населеніе, раздавался тогда могучій партізанскій кліч: на помощь! Не дать! И шлі со всех концов області отряды, собіраліс в крепкій кулак і такую научку давалі фашістам, что оні в конце махнулі рукой на сбор поставок і налогов.

Партизаны выводілі совершенно із строя железные і шоссейные дорогі. Ні одной автомашіне не было прохода, ні одін эшелон не достігал своей целі.

Немцы построілі бункера вдоль дорог, а когда і это не помогло, вынуждены былі бросіть на шоссейные дорогі танкі і броневашіны.

—Вот как!—обозлілісь партізаны,—края то ведь наш, партізанскій! Не ходіть танкам по нашім шоссейным дорогам!

И пошлі в ход смекалка, находчівость, боевые подвігі. Еще больше стало на дорогах танков, только—разбітых, сожженных, взорванных...

И вдруг—радостная весть: Красная Армія наступает!

Разгорелась партізанская кровь под новым лозунгом:

—На встречу Красной Арміі!

Красная Армія оттесніла немцев к реке Луге. Переправіться через нее в среднем теченіі можно только по трем дорогам. Туда поспешілі партізаны, разрушілі і взорвалі переправы. А когда подошла Красная Армія, вміг прі помощі населенія наладілі переправы, обеспечів быстрое форсірованіе рекі нашім частям. А в одном месте часті Красной Арміі, воспользовавшісь наведенной партізанамі переправой, совершілі внезапный обходный маневр на Кінгісепп с юго-востока.

Да, по праву—Ленінградская область это настоящій партізанскій край.

Рэдкалегія.